# Адшукаць Шчорсаўскія скарбы

Ірына ЦАРУК,
намеснік дырэктара
Навагрудскай ЦБС

**Першыя Шчорсаўскія чытанні па тэме "Развіццё бібліятэчнай справы на Гродзеншчыне. Дзяржаўныя і прыватныя зборы" прайшлі ў Навагрудскім раёне. Арганізатарамі выступілі ўпраўленне культуры Гродзенскага аблвыканкама, Навагрудскі райвыканкам, Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я. Карскага, Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы, Навагрудская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма.**

Штуршком для правядзення чытанняў у Шчорсах стала абвяшчэнне Года кнігі ў Беларусі. Нельга забывацца, што Шчорсы ў XVIII — XIX стагоддзях былі сапраўдным культурным цэнтрам са знакамітай на абшарах былога Вялікага Княства Літоўскага бібліятэкай, у якой у розныя часы захоўвалася ад 9 да 20 тысяч кніг, манускрыптаў, рукапісаў, карт. Меліся калекцыі археалагічных знаходак і карцін. Сам маёнтак прываблівaў дасканалымі архітэктурнымі формамі, прыгожым паркам і ўнікальнай аранжарэяй. Ды і сёння Шчорсы — гэта маляўнічы, прыгожы куток, дзе пануе дух шляхетнасці і інтэлігентнасці, дзе моцная гаспадарка і гасцінныя людзі, якія для ўдзельнікаў чытанняў стварылі атмасферу свята.

У Шчорсаўскіх чытаннях бралі ўдзел прадстаўнікі ўлады, супрацоўнікі бібліятэк, музеяў, настаўнікі, выкладчыкі вышэйшых і сярэдніх спецыяльных устаноў адукацыі, грамадскасць. Ва ўрачыстай абстаноўцы навагрудчане віталі гасцей з Мінска, Беластока, Гродна. З прывітальным словам выступіла намеснік старшыні Навагрудскага райвыканкама Алена Ермакова.

Навуковыя супрацоўнікі з Гродна і Мінска распавялі пра свае грунтоўныя даследаванні па тэме. Акцэнт быў зроблены на ролі Іаахіма Храптовіча ў асветніцкіх працэсах і сацыяльна-гаспадарчых увядзеннях у маёнтку Шчорсы. Гаворка ішла пра першыя медыцынскія бібліятэкі на Гродзеншчыне і першую публічную бібліятэку ў Навагрудку, якая размяшчалася ў будынку былой Дамініканскай школы. Цікавымі атрымаліся даклады пра ланкастэрскія школы, адна з якіх працавала і ў Шчорсах, пра фонды роду Сапегаў, першыя газеты Навагрaдчыны, выданні Гродзенскай губернскай друкарні, што захоўваюцца ў фондах Гродзенскай абласной бібліятэкі. Госці наведалі рэшткі былога графскага палаца, царкву Дзмітрыя Салунскага, Свята-Елісееўскі Лаўрышаўскі манастыр, Навагрудскі замак.



*Выступае намеснік старшыні навагрудскага райвыканкама А. Ермакова.*

Падчас чытанняў працавала выстаўка народна-прыкладнога мастацтва "Творчасць маіх землякоў". Прыцягвала ўвагу прысутных галерэя інтэлектуальнай спадчыны "Шчорсаўскія скарбы", дзе дэманстраваліся кніжныя, часопісныя выданні, фотаздымкі, прысвечаныя гісторыі Шчорсаў. Прадстаўленыя выдавецкія працы Навагрудскай цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы дазволілі пазнаёміцца з арыгінальным падыходам да збору матэрыялаў па краязнаўстве, іх сістэматызацыі і выкарыстанню бібліяграфічнай прадукцыі для папулярызацыі раёна.

На думку дырэктара Падлянскай ваяводскай бібліятэкі Яна Леанчука, фонды буйных бібліятэк Беларусі, Літвы, Польшчы стануць даступнымі любому жыхару нашых краін, нягледзячы на межы. Старшыня Шчорсаўскага сельсавета Генрых Лукоўскі выказаў спадзяванне, што чытанні паспрыяюць пошуку інвестара, які здолее ўдыхнуць жыццё ў былы палац Храптовічаў.

Наступныя "Шчорсаўскія чытанні" пройдуць праз два гады, а Навагрудскай цэнтральнай раённай бібліятэцы за гэты час можа быць прысвоена імя Іаахіма Літавора Храптовіча.